# Фрагменты будучых выданняў

Адной з ключавых тэмаў, якая рэгулярна знаходзіла сваё адлюстраванне на старонках нашага часопіса ўсе 18 гадоў яго існавання, была гісторыя Другой сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі. За гэты час выйшла ў свет некалькі тэматычных нумароў, цалкам ці ў значнай ступені прысвечаных гэтай праблеме[1]. Акрамя таго, асобныя публікацыі змяшчаліся і ў іншых нумарах[2]. Не абыходзілася тэма вайны і ў некаторых кніжных выданнях, што пастаянна выходзяць пад маркай афіляваных з часопісам выдавецтваў[3].

[1] ARCHE. 1999. № 2 (Вялікая Айчынная вайна); 2008. № 5 (Беларусь пад нямецкай акупацыяй); 2010. № 5 (Як Гітлер мог перамагчы); 2010. № 7—8 (Тэрор і прапаганда ў акупаванай Беларусі); 2013. № 1 (Паліцаі і партызаны); 2013. № 3 (Ахвяры і каты); 2015. № 5 (Польшча ў Другой сусветнай вайне).

[2] Фрыдман А. Невядомы генацыд: знішчэнне беларускіх цыганоў у 1941—1944 // ARCHE. 2004. № 2. С. 130—142; Урывак зь дзёньніка Карла Пэтэрса, жаўнера 233-га пяхотнага палка (102-я пяхотная дывізія, 9-я Армія, група армій «Цэнтар») / Публікацыя М. Баўтовіча // ARCHE. 2009. № 4. С. 347—357; Грыбоўскі Ю. Беларускі рух і Нямеччына напярэдадні і ў пачатку Другой сусветнай вайны // ARCHE. 2009. № 5. С. 144—160; Нямецкая акупацыя і лёс яўрэяў Гродна / Калектыўны аналіз ізраільскіх гісторыкаў з мемарыяльнага цэнтру «Яд Вашэм», заснаваны на пісьмовых сведчаннях гродзенскіх яўрэяў // ARCHE. 2010. № 1—2. С. 385—457; Сільвановіч С. Польскае насельніцтва на тэрыторыі заходняга Палесся напярэдадні і ў пачатку Другой сусветнай вайны // ARCHE. 2011. № 3. С. 410—425; Фрыдман А. Менск у пачатку кастрычніка 1942 года: «першыя вольныя дажынкі» // ARCHE. 2011. № 7—8. С. 174—187; Рудлінг П. А. Непрыкметны генацыд: Халакост у Беларусі // ARCHE. 2013. № 2. С. 120—139; Ганцэр К. Нямецкія і савецкія страты як паказчык працягласці і інтэнсіўнасці баёў за Брэсцкую крэпасць // ARCHE. 2014. № 5. С. 135—153; Штопэр С. «Дарога — нямецкая». Савецкая партызанская вайна і яе ваенная эфэктыўнасьць: дасьледаваньне лягістыкі вэрмахту на Бранішчыне ў красавіку—ліпені 1943 г. // ARCHE. 2014. № 5. С. 154—187.

[3] Гл.: Юрэвіч Л. Жыцьцё пад агнём. Партрэт беларускага военачальніка і палітычнага дзеяча Барыса Рагулі на фоне яго эпохі. Менск, 1999; Туронак Ю. Мадэрная гісторыя Беларусі. Вільня, 2008; Бартушка М. Партызанская вайна ў Беларусі ў 1941—1944 гг. Беласток, 2011; 2-е выд., папраўленае. — Беласток, 2012; 3-е выд. — Смаленск, 2013; Рэйн Л. Каралі і пешкі: калабарацыя ў Беларусі ў час Другой сусветнай вайны. Смаленск, 2015; Брест. Лето 1941 г. Документы. Материалы. Фотографии / Авт.-сост.: К. Ганцер (рук. группы) [и др.]. Смоленск, 2016.

Усе згаданыя публікацыі ў большай ці меншай ступені спрыялі пашырэнню ў беларускім грамадстве візіі той вайны, адрознай ад міфалагізаванай версіі, што ўзнікла яшчэ ў савецкі час і якую цяперашнія афіцыйныя ідэолагі намагаюцца, часам насуперак усялякаму здароваму сэнсу, ўратаваць. Аднак шыла ў мяху пры цяперашнім узроўні развіцця інфармацыйных тэхналогій утаіць зусім нерэальна, дзеля чаго нават публікацыі многіх беларускіх ваенных гісторыкаў, што працуюць у дзяржаўных навуковых і адукацыйных установах, сёння не зусім адпавядаюць нейкім цвёрда ўсталяваным шаблонам. Працэс пераасэнсавання як нашымі навукоўцамі, так і ўсім грамадствам ваенных падзей можна запаволіць, але зусім стрымаць немагчыма. Тым больш калі шматлікія публікацыі пра Другую сусветную вайну, датычных Беларусі, рэгулярна выходзяць за яе межамі і так ці іначай робяцца вядомымі ў нашай краіне.

Але быць вядомым не азначае быць шырока даступным. Перадусім на перашкодзе вольнаму азнаямленню беларусамі з дасягненнямі сучаснай замежнай гістарыяграфіі стаіць моўны бар’ер. У сувязі з гэтым актуальнай задачай з’яўляецца пераклад найбольш вартых узораў гэтай гістарыяграфіі на беларускую мову, што з даўніх часоў рэгулярна ініцыюе ды ажыццяўляе рэдакцыя «ARCHE». Ужо некалькі гадоў намі вядзецца праца па падрыхтоўцы беларускамоўных выданняў грунтоўных навуковых манаграфій нямецкіх гісторыкаў Фелікса Акермана, Аляксандра Бракеля, Крысціяна Герлаха, Бабетэ Квінкерт, польскага навукоўца Богдана Мусяла, беларускага даследчыка польскага паходжання Зыгмунта Барадзіна[4]. На жаль, у цяперашнія няпростыя часы выданне ўсяго гэтага багацця можа расцягнуцца на гады. Пакуль жа мы на старонках дадзенага нумара друкуем выбраныя фрагменты з гэтых прац, уводзячы іх тым самым у больш шырокі ўжытак.

*Рэдакцыя*

[4] Ackermann F. Palimpsest Grodno. Nationalisierung, Nivellierung und Sowjetisierung einer mitteleuropäischen Stadt 1919—1991. Wiesbaden, 2010; Brakel A. Unter Rotem Stern und Hakenkreuz: Baranowicze 1939 bis 1944. Das westliche Weißrussland unter sowjetischer und deutscher Besatzung. Paderborn—München—Wien—Zürich, 2009; Gerlach Ch. Kalkulierte Morde. Die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weißrussland 1941 bis 1944. Hamburg, 1999; Quinkert B. Propaganda und Terror in Weißrussland 1941—1944. Die deutsche «geistige» Kriegsführung gegen Zivilbevölkerung und Partisanen. Paderborn, 2009; Musial B. Sowjetische Partisanen 1941—1944: Mythos und Wirklichkeit. Paderborn, 2009; Boradyn Z. Niemen — rzeka niezgody: polsko-sowiecka wojna partyzancka na Nowogródczyźnie 1943—1944. Warszawa, 1999; wyd. 2 — Warszawa, 2013.